

Download



"Вясна" назірае

⚡⚡**Катаванні ў Фрунзенскім РУУСе працягваюцца: жанчыне пагражалі ўдарыць электрашокерам і зацiснуць нос стэплерам, каб яна падпісала пратакол, па якому яе асудзілі на 25 сутак**

У пачатку чэрвеня жанчына (яе імя і прозвішча не называецца ў мэтах бяспекі) вярталася дадому, калі разам з ёй у ліфт зайшлі два мужчыны. Ужо на яе паверсе гэтыя мужчыны заявілі, **што яны з міліцыі і ідуць да яе, каб правесці ператрус**. Па версіі аднаго з супрацоўнікаў міліцыі, жанчына «не пускала іх у кватэру, чым перашкаджала міліцыянерам», за што на яе склалі пратакол **па арт. 24.3 КаАП. Падчас ператрусу ў мінчанкі канфіскавалі тэхніку, грошы з гаманца і каштоўнасці.** Потым яе адвезлі ў Фрунзенскі РУУС, дзе на жанчыну склалі яшчэ адзін пратакол **па арт. 19.1 КаАП (дробнае хуліганства)** за тое, што яна падчас допыту нібыта «абразліва паводзіла сябе ў адносінах да супрацоўнікаў, нецэнзурна лаялася, раскідвала паперы на стале і кінула на падлогу аловак».

Жанчына на судзе ўсё адмаўляла. Яна распавяла суддзе Марыі Ярохінай, **што ў РУУСе супраць яе з боку міліцыянтаў быў аказаны маральны ціск: ёй пагражалі ўдарыць электрашокерам і зацiснуць нос стэплерам. Жанчына дрэнна бачыць, і без акуляраў, якія ёй не дазволілі ўзяць з сабою, не можа нічога прачытаць.** Таму яна папрасіла супрацоўнікаў прачытаць пратакол услых, на што атрымала адмову. **Каб пазбегчы катаванняў, яна была вымушана падпісаць пратакол.**

Відэакамеры на тэрыторыі РУУСа, як звычайна, «не працавалі». Па словах сведкі, нагрудных відэарэгістратараў у міліцыянтаў не было. Але сама жанчына дакладна памятае, што камера ўсё ж такі ў міліцыянта была.

⚖У выніку, **суддзя Фрунзенскага раёна Марыя Ярохіна**, негледзячы на паказанні жанчыны і заяву пра ціск з боку супрацоўнікаў РУУСа, прызнала яе вінаватай і арыштавала па двух пратаколах на **25 сутак.**

❗Адзначым, што гэта не першае паведамленне праваабаронцам за апошні месяц пра пагрозы і катаванні ў Фрунзенскім РУУСе. Па словах яшчэ адной затрыманай, **два тыдні таму ва ўпраўленні жанчыну душылі яе ж шнуркамі і білі электрашокерам, каб прымусіць разблакаваць тэлефон**. Суддзі на судовых працэсах на гэта ўвагу не звяртаюць і наадварот прысуджаюць максімальныя «суткі».

Відэа катаванняў падчас жнівеньскіх падзей менавіта з Фрунзенскага РУУС з'явілася ў інтэрнэце.
t.me/viasnanazirae/360
53.3K viewsedited Jun 9, 2021 at 14:55

Context

Embed

View In Channel

```
<script async
src="https://telegram.or
g/js/telegram-widget.js?
```

Copy